БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: [С]ерпухоуская вул. д. № 12

[Рэ]дакцыя адчынена ад 1 да 2 гадз пасьля поудня
[Ад]міністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз
У вечары ад 5 да 7 гадз.

[Рэ]дакцыя пакідае за сабой права па[п]раўляць перасыланые рукапісы і корэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Падпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак: за верш пэтыту на 1-й стран. 1 руб на апошняй—50 кап.

[№] 68. Менск. Нядзеля 16 чэрвеня 1918 г. Год I

АБВЕСТКА.

Гэрманскім Градоначальствам будзе прадавацца у пят[ні]цу, суботу і нядзелю у мясных крамах і магазінах некольк[і] тысяч фунтау коубасы па 6 марак за фунт. Коубаса [в]ывезена з Украіны і зроблена з добраго чыстаго сьвінаго [і] валоваго мяса. Прадажа ідзецьні па бонах.

Гэрманскі Градоначальнік.
Харчавы аддзел.
ГЭРШЕЛЬ.

[Р]асцярушанае багацце.

«Эвакуацыі» прычынілі [кр]аінам б. імпэрыі шмат шкоды, [я]кую ні лехка і ні скора можа будзе направіць. Над ні[ез]аможным націскам нямецкіх [в]ойск ад гораду да гораду, ад [л]іні абароны да ліні абароны [а]дступалі расійскія арміі, а [п]ерад імі вывозіліся—«эвакуіроваліся» з намечаных да ад[да]чы мейсц поруч с тэхнічнымі [п]рэдпрыімствамі, якія па праудзі маглі станавіць сабою ва[ж]ную дабычу немцау, губэр[н]скія павятовыя і валастныя ад[м]іністрацыйныя установы з усімі іхнімі справамі і архівамі, публічныя біблотэкі, архівы і музэі, школы, пачынаю[ч]ы ад высшых закладау да самых нізшых. Вывозілося і літэральна раскідалося на твару усей імпэрыі.

Мімаволі думалося тады: для чаго гэта робіцца? Каб ўратаваць ад зьнішчэньня? — Дык жа рускія арміі спакойна накідалі гарады і яны даставаліся немцам без бою, ні зьнішчэнымі? Каб ні пакінуць «непрыяцелю» дабычу? Дык якую-ж дабычу маглі становіць сабой канцылярыі і архівы усякіх установ, албо тысячы школ з іх падручнікамі пісанымі па руску а ні па нямецку, з фізычнымі і іншымі габінетамі, каторыя пэўна-ж немцы ні лічылі бы сваей «дабычай»?

І вось ад руйнацыі, якую рабіло, німа ведама для чаго, рускае войско поуз-сьцеяныя краі б. імпэрыі пацярпелі бадай ці ні больш, чым ад ваенных падзеяу. Пацярпела у тым ліку і Беларусь.

Ні кажучы нічога на гэты раз аб стратах у да шчэнту зьнішчэнай прамысловасьці, у разбуранай да тла сельскай гаспадарцэ, у нізьлічаных «бежанскіх» ахвярах, якія крыжамі адзначыліся па усіх закутках агромністаго расійскаго абшару,—культурныя страты нашаго краю ні маюць сабе цаны.

Усе, над стварэнием чаго дзесяткамі часу затрудняласяся сягаушая да прасьветы Беларусь: школы, бібліотэкі, музэі, учоныя архівы, скасовано энэргічнымі росчыркамі пяра бравых расійскіх эвакуатарау.

Ні усе вывезеныя з Беларусі культурныя установы спаткау аднаковы льос: адны з іх валяліся па складах і раскрадаліся адтуль, другія мадзелі сяк-так, цягнучы свае існаваньне усілкамі шчырых краевых патрыотау. Ні аб усіх мы маем поуныя весткі. Яны пагубляліся сярод расійскай без талкоушчыны. Але без мала ні усюдах, дзе есьць эвакуіраваныя школы, есьць некольк[і] чалавек, якія марань аб звароце іх дамоу і сваім, хаця і ні властным у гэтым дзеле, вокам чуваюць над імі.

Парушаючай да сьлез была скарга, якую пачуу пішучы гэтыя радкі ад дырэктара нашай Маладэчанскай Настаўніцкай Сэмінарыі, якую льос закінуу усяго інчэ тольк[і] у Смаленск, яг. Ярушэвіча: «Я, панночку, трэці год ужо змагаюся за тое, каб сэмінарыя асталася нашай. І што далей, то робіцца усе цяжэй, бо за шмат есьць скваных рук на нашае дабро. Увесь час я стараюся, каб з закладу выходзілі якія былі карыстнымі нашаму краю і мне, дзякаваць Богу, інчэ да гэтуль удалося захаваць беларускі склад вучняу. Але цяжка, цяжка! Папрасіце тамака (у Менску) якоі помачы для нас».

У некольких кватэрах прыткнулася Менская гімназія у Маскве, бароніць сябе, яко уласнасьць Беларусі. Менскі Настаўніцкі Інстытут у Яраслаўлю, удаецца с прозьбамі да Украінскаго ураду аб захаваньні яе для Беларусі. Віленская 1 гімназыя, якая ні мае на што жыць у Глухаве Чарн. губ... І так болей і так далей... А аб нізшых школах і саусім чуваць ні апрача двух: Менскай двухкласнай у Казані і, здаецца нейкай Гародненскай у Калузе.

Трэба каб Народнае Сэкрэтарство Асьветы прышло да іх с помаччу і разам начало зьбіраць для Бацькаушчыны гэта расьцярушанае дурнымі рукамі багацце. Яно павінно наладзіць рэгістрацыю усіх вывезеных з Беларусі школау і навуковых закладау і цяпер жа завязаць перагаворы з урадамі Вялікаросіі і Украіны аб звароце іх дамоу. Бавіць нельга, бо дабро гэтае расцягваецца і нішчыцца у складах. Паусюдах у Вялікарускіх і Украінскіх гарадах есьць арганізацыі і асобныя людзі з беларусау, якім можна даручыць апеку над гэтым культурным багаццем запасшыся згодай адпаведніх урадау.

Разам с тым трэба наладзіць і апеку над забыткамі вывезенымі у Расію і Украіну, як у часе вайны так і раней і рэгістрацыю іх. Для гэтаго у нас знойдуцца адпаведныя сілы, як у Маскве і Пецярбургу так і у Кіеві, каторым ведама дзе і што перахоуваецца.

Наладжываючы справу заховання забыткау за абмежкамі Беларусі, трэба зьвярнуць увагу і на тое, што есьць тут, на мейсцы. Мы ведаем, што адсюль інчэ да вайны ішла павольная «эвакуацыя» найцэннейшых забыткау краевай гісторыі у польскія зборы у Львове і Кракове. Але усе-ж такі большая часьць абыватэльства нашаго, у якога перахоуваліся гэтыя цэнныя рэчы, хавалі іх для краю. Цяпер калі барбарынство большэвікоу і падюджваных імі селян напясло ні па праўныя ушчэрбы гэтаму краеваму скарбу, шляхэтныя замеры нашых мэцэнсау гісторыі паддаліся моцнаму вагапню. Шмат чаго можа беспаваротна утраціцца для краю пры такім настрою.

Трэба запабегчы гэтаму створэннем «краеваго таварыства забыткау» замест існуючаго цяпер у Менску польскаго таварыства, катораму належыць прынесьці шчырую падзяку за шмат чаго, ўратаванаго ім у часы большэвіцкай разрухі.

А. Н.

Стан рынку працы у Нямеччыне у сакавіку г. г.

Высокія запатрэбавання гаспадарскаго жыцця у ваенны час, якія нямецкая промысловасьць задаволівала ужо праз гады, ні зьменшыліся і у сакавіку г. г. і нямецкая промысловасьць аказалася на роўні з імі. А важнейшыя галіны прамысловасьці здалелі нават падвышшыць сваю продукцыю надтрыманьня палепшэннем комуннізацыі.

Горны і мэталоплавільны промыслы у сакавіку карысна разьвіваліся і далей. У зьвязку с палажэннем коммунікацыі палепшылося палажэнне у жалезным і мэталічным промыслах. Палажэнне машыновай і электрычнай прамысловасьці асталося такім самым добрым, як і у прошлым месяцу.

Адчоты касс ўзаёмнай помачы (шпітальных касс) паказуюць што да 1 красавіка у параўнанні с палажэннем 11 сакавіка г. г. лічба нізанятых работай членаў касс дайшла да 1813 ч Лічба гэта настолькі малая, што у параўнанні з занятымі членамі можа быць вызначана як 0,0%. Пры гэтым лічба нізанятых работай мужчын проціу прошлаго месяцу павялічылася на 0,1%. У параўнананні с пачаткам сакавіка, калі лічба занятых работай людзей зьменьшылася на 1,0% палажэнне на пачатку красавіка сталося лепшым.

Проці прошлагодняго, сягалятняе становішчо ёсьць крыху горшым: 1 красавіка 1917 году давялося відзець павышэнне лічбы занятых работнікаў на 1,2%. Аднак пры зьлічэнні лічбы безработных подлуг статыстыкі проф. зьвязкаў у сакавіку месяцу за папярэднія гады, бачым, што у сакавіку г. г. лічба безработных меньшая. У сакавіку 1917 безработных было 1,3, у 1916 годзе 2,2, у 1915 3,3% у сакавіку 1914 г.— значыць перад вайной—2,8%.

Статыстыка біржаў працы паказуе у сакавіку г. г. далейшае зьменьшэнне лічбы асоб шукаючых працы. На каждыя 100 вольных мейсц знайходзілася на мужчынскім рынку 56 [у лютым 58] і на рынку кабет 85 заместа 93 у лютым (на кожн. 100 мейсц). Прапазыцыя кабечай працы пакрывала толькі каля 4/5 запатрабаванняў. Подлуг адчотаў прамысловых прэдпрыемстваў на мушчынскім рынку працы зауважаецца крыху мацнейшая падача мушчынскай працы.

(З «Католік»-а).

На беларускім шляху.

У Кіеве ад 30 мая г. г. пачала выходзіць новая беларуская газэта пад назваю «Бѣлорусское Эхо». — Палітычны, літэратурны і экономічны орган. Газэта друкуецца у рускай мові. Літэратурны аддзел па беларуску. Замешчаны у №№ 1 і 2 артыкул «ад Рэдакцыі» прагалашае:

«Рэдакцыя газэты «Беларускае Рэхо» лічучы патрэбным азнаймляць сваіх землякоў, якія жывуць на Украіне, аб усіх здарэннях як на Украіне, так, главным чынам, і у мітраполіі і зьвязаных з змаганнем беларускаго народу за едзінство і дзержаўнае істнаванне, прыступае да выдаўніцтва газэты у поўнай надзеі на усьпех свайго дзела. Сучаснае палітычнае жыцце занадто багато зьместам; стан беларускаго адраджэння досыць яскравы для таго, каб ўзбу-

дзіць да сябе цікавасьць шырокіх коляў ні толькі беларускаго грамадзянства на Украіне, але так сама украінцау і членаў іншых нацыянальных сем'яў. Жадаючы як найлепей паставіць інформацыю з мейсц і з найбольшай безстароннасьцю асьветляць пытання, якія будуць зачэпляны на старонках «Беларускаго рэха», рэдакцыя запрасіла да працы рад значнейшых імен беларускіх дзеячоў і устанавіла зьвязак з усімі вялікшымі местамі Беларусі і Украіны.»

Зьмест першых №№ газэты як найлепей адказуе замеркаванням рэдакцыі: Палітычныя артыкулы [есьць напісаныя і па беларуску], дописы з розных мейсц, вялікая інформацыя— паказуюць, што каля газэты сабраліся моцныя, паважныя сілы. Пабажаем-жа ім удачы і вытрываласьці ў рабоце!

Кіеў. 14 мая г, г. у Кіеў прыбылі з Гомлю Прэзэс Выканаўчаго Камітэту Палесскіх жалезьніц І. С. Нецецкі і чл. Камітэту К. А. Гушча і А. Н. Выходцаў для устаноўлення зьвязку с Цэнтральным Кам. Поўднева-Зах жалезн. і высвенення нікаторых пытанняў у Міністэрстві дарог, як фінансоваго. так і харчоваго характэру.

У міністэрстве азначаным прэдстаўнікам удалося высьніць, што Гомель, як вузел жалезьніц Беларусі, толькі да часу знайходзіцца у карыстанні Украіны. На грунце гэтаго дэлегаты на пасядзэннях профэссіон. зьвязкаў участнічалі с правам толькі дарадчаго голасу.

„Б. Э.“

АДЭССА. Конструкцыя Нацыянальнаго Коміссарыяту— выкон. органу Нацыянальнай Беларускай Рады—такая: Старшыня Коміссарыяту і упоўнамочаныя: па нацыянальна-палітычным, войскавым, культурна-прасьветным справам, па эвакуацыі беларусаў на айчызну, па гаспадарска-фінансавым справам, скарбнік і пісар.

Аднашэнне Украінскаго Акружнаго Каміссарыяту ад 4 красавіка 1918 г. за № 32 Беларускі нацыянальны Каміссарыят прызнаны органам оффіцыяльным, маючым моцу абароны інтарэсаў насялення.

Істнуючае у Адэсі культурна-прасьветнае згромаджэнне пад назваю «Беларускі Гай» у цяперашні час мае сваю труппу, аркестр, хор і бібліотэку. Штотыдня уладжываюцца тэатральныя беларускія выставы.

— —

12 красавіка на агульным сходзе уцекачоў беларусаў у м. Адэссі, Усерасійскі аддзел «Бѣженскаго Комитета» у Адэсі дзякуючы значнай перавазе у ім уцекачоў беларусаў, перанайменованы у Беларускі Камітэт для уцекачоў. 14 мая у зьвязку з перанайменаваннем адбыліся перавыбары дэлегатаў Камітэту. **«Б. Э.»**

Агульныя вesткі.

— —

КОПЭНГАГА. 12 гм. «Voss. Ztg.» Начальнік фінляндскаго войска у Барысаглебску паведамляе. як дапосіць «Berl. Tig.» што фінляндскае войско дзеля браку харчоў на Мурманскім пабярэжжу перастуліло норвэжскую граніцу. З прычыны інтэрнірования яго Норвэгіяй зложаны пратэст,

БЭРЛІН 12. Як даведываецца «B. Lokal nc.» з міністэрства загранічных спраў, нямецкі ваенны урад у Румыніі поўзяў становучыя крокі проціў гвалтоў румынскіх жаўнераў над нямецкімі падданымі у Бэссарабіі.

— — — —

Вesткі з Расіі.

— —

ШТОКГОЛЬМ, 12/XI. Як паведамляюць, у Расію прыбыло шмат ангэльцаў, ведаючых расійскую мову і маючых расійскія паспарты. Думаюць, што гэты прыезд знаходзіцца у зьвязі с контр-рэвалюцыйнымі інтрыгамі дзержаў Згоды у Расіі.

РЫГА. «Балтыйскай Газэце» пішуць з Лескаў: Адна асоба прыехаўшая нідаўна с Пецярбургу, паведамляе аб цэнах на харчовыя прадукты. Фунт цукру каштуе там цяпер 28 руб. За адзін кавалак цукру на Неўскім бяруць 75 капеяк. Фунт аўсянай мукі каштуе 10 руб. Селянкі на Варшаўскім вакзале прадаюць фунт тварагу за 4 р. 50 к. За блешанку кансэрўнаго малака бяруць 19 р., за консэрўнае мясо, якое вельмі цяжка дастаць,—па 15 р. за блешанку. На карамель ніжэйшая цана чым па цукер. Яна каштуе 20 р. ф, пара чулок —15 р. 50 к. Другая асоба паведамляе аб праездзнай цане: У Торошыне за білет 2-ой клясы да Пецярбургу бяруць 18 руб. Касіер на Варшаўскім вакзале прадаваў білеты да Торошына за 20 рублёў. Ад Пецярбургу да Лескаў ізвозчык каштуе 60 рублёў. Жалезнадарожная станцыя Торошыно ўсяго 15 вёрст адгэтуль.

— — —

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

— —

У упраўленскай канторы службы рэмонта і пуці Л. Р. ж. д. сярод служачых выдзелена группа „20“ па эксплоатацыі, аплата працы якіх прынята за рахунак нямецкай скарбніцы.

Гэта—другая спроба: першая —у самым пачатку пасьля акупацыі мела мейсцо у упраўленскай канторы магазінай службы.

— —

Дадатачная выдача цукру па 1 фунту на душу адбудзецца на будучым тыдні.

— —

Афіцыяльнае паведамленне нямецкаго вярхоўна[га] камандавання за 14 чэрвеня 1918 року.

Захадні тэатр вайны.

Група арміяў Кронпрынца Рупрэхта.

Паўднёвей-захадней Іпериа французы павялі сільн[ыя] атакі проціў нашых лініі памеж Воормезеле і Фірстраа[т] яны былі адбіты з вялікімі для ворага стратамі. Некольк[і] афіцэраў і болей 150 салдат папалі да нас у палон. Ус[]пешныя разьведачныя стычкі у Кеммэля.

На другім фронце баевая дзеяльнасьць ажыўляла[ся] толькі часамі.

Група арміяў Германскаго Кронпрынца.

Каля Нуайона артылерыйская дзеяльнасьць аставала[ся] усіленай. У Курсель і Мэры, а так сама у даліне р. Ма[ц] каля Уасзы, на захад ад яе, вораг паўтарыў свае безусьпе[ш]ныя контр-атакі. Яны былі адбіты з вялікімі для вора[га] стратамі. Па абодвым бакам дарогі Суассон—Віллер—Ко[т]рэ мы уварваліся у лес Віллер—Котрэ.

Армія генэрал-палкоўніка фон-Бэм захапіла ад 27-[го] мая болей 830 арудзій. Такім чынам лік арудзій ўзяты[х] групцай армій Гэрм. Кронпрынца ад 27-го мая даходзі[ць] да 1050.

Учора зьбіты намі 28 варожых аэраплянаў. Капіт[ан] Бэртгольд атрымаў сваю 34, лейтэнант Удэт сваю 29, обэ[р] лейтэнант л'Эрзэр сваю 25-ю перамогу у паветры.

За май месяц вораг страціў на нямецкіх фронтах 2[?] прывязных шары і 413 аэрапляняў, з якіх 223 упалі [у] нашэ распалажэнне, а рэшта па тую старану варожых л[і]ній. Мы страцілі у бітвах 180 аэрапляпаў і 28 прывязны[х] шароў.

Першы Генэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф.**

У І-м пазычкова-зьберагацельным Т-ве гадавы сход поунамоцных дзеля разгляду і пацьвярджэння падрахунку за быушы год, сьметы на бягучы і выборы асоб для пасад (выходзяць па чарге Бэссер, Ігнатовіч і інш.) адбудзецца 30 чэрвеня, другі (у выпадку ніудачы с кворыумам)—7/VII і 15/VII—трэці (пры якім бы ні было ліку членау.

Пазычкова-зьберагацельнае Т-во рашылі пачаць рэпрэсіі к нідаімшчыкам, якіх ні было за увесь час вайны.

Гэтыя рэпрэсіі—узыскання праз паліцыю, аж да опісі, мення.

— —

У жаноцкай хрысьціянскай гімназіі (б. школа духоунаго ведамства, Шырокая ул.) група прэдстаунікау праваго крыла унесла у пэдагогічную раду пісьменны пратэст проціу дырэктара Сушчынскаго. як папаушаго на гэту пасаду ні с кругу вучыц. пэрсоналу гэтай школы.

Пратэстанты—такого пагляду, каб у гімназіі прынімаліся толькі хрысьціянкі.

— —

Экстрэная рэвізія меськай камісіі па апалу—па загаду нямецкіх уласьцей — як нам перэдаюць, выклікана маючым быць пераходам камісіі у новыя рукі.

— —

Выстаука нямецкай газэты X арміі у Вільні к канцу месяца мае быць перанесена у Менск.

— —

Сярод арэндатароу усіх царкоуна-манастырскіх зямель напомнено ад вотчынікау аб ніадкладнай уплаце нідаімак, запушчаных за час вайны, іначай—судзебныя рэпрэсіі, аж да скасавання умовау, зносу дамоу і выселення.

— —

Пачтовая гімназія з Маломанастырскаго пер. перанесена на Белацэрконую 28.

У старым памешканні, па Маломанаст. пер. па ініцыятыве дырэктара гімназіі Л. Цыткова, маюць быць адчынены курсы.

— —

Зьменшэнне штатау меськай управы пачнецца з грамадзянскаго аддзелу, затым пойдзе па парадку: гаспадарскі, кватэрны. біржэвы і статыстычны.

— —

Коубаса па 6 марак за фунт, прывезеная з Украіны, прадаецца гэрманскім градоначальствам у пятніцу, суботу і нядзелю ва усіх крамах мясных магазінах,—с чыстай добрай сьвініны і гавядзіны без бонавых картачак.

— —

Кашченко і Зальманоу 9 г.м. у Смаленску мелі прыязьненую бяседу у камісарыяце захадняй вобласьці з Рэзаускім.

— —

«Беларуская Рэспубліка і жыдоускі пролетарыят». На гэты тэмат 9-го г.м. у Смаленску чытау лекцыю член Беларускай Рады Гутман.

Вesткі с краю.

— —

Бабруйск. Ад 1-го чэрвеня пачалася здача грамадзкаго упраўлення места і мелася закончыцца да 5-го червеня. Ад гэтаго часу место пераходзіць поўнасьцю пад загад нямецкіх акупацыйных ўласьцей. Фортэцыю займаюць нямецкія войскі. Усюды пастаулены нямецкія караулы.

У месьце ўсе гасьцініцы поўныя прыезджаючымі. Часьць мення корпуса была пушчана у прадажу, шмат было вывезено і растаскано са складаў і у месьці ідзець шалёная купля—прадажа. Польскі комэндант, ротмістр Войтэкунас, апавешчаў, што улічэнных у скупцы раскрадзеных рэчэй будзе караць аж да растрэлу.

Вялікае ўражэнне зрабіло у месьці самагубство польскаго ахфіцэра, пробуючаго арэштаваць генэрала Довбар-Мусніцкаго за яго згоду здаць зброі.

Другія учасьнікі загавора проціў Д.-Мусніцкаго ўцяклі на аўтамабіле з Бабруйску і толькі адзін, назначэны у камэндатуры, арэштован.

Наагул, жыццё у месьці ідзець мірно. Хлеб каштуе— 1 р. 50 к. ф., цукер—4р.50 к. ф., белая булка—1 р. і болей штука. Кандытэрскіх печэнн[я] шмат. Польская « Пляпувк[а]» зачыняна. Польская труппа тэатры канчае сваі спэктакл[і].

— **Рэквізыцыя гумы.** Ста[рэйшы] гауптман апавешчае. што вал[а]дзельцы павозак на гумах п[а]вінны ні пазьней, як 30 чэр[]веня, ад 8 да 1 і ад 4 [да] 8 гадз. здаць гумовыя абад[ы] Дамініканская 3, пакой 3. [За] кілё ім будуць плаціць да 1[] марак За ніслухнянасьць в[ін]навайцаў будуць караць, а г[у]му забіраць без ніякае плат[ы].

— **З Ігумену.** Менскай гу[б.] Заходам члена Рады Б. [Н.] Р., Юстына Мурашкі, у Іг[у]менскім павеці адкрыты 4 б[е]ларускія школы і аснаван[а] некалькі культурна-прасьве[т]ных кружкоў з маладзёжы [і] мейсцовых грамадзкіх дзеячо[ў]. Па ўсім павеці адбываюц[ца] беларускія прэдстаўленні, ка[н]нэрты і т. п.

Рэдактар **А. Прушынскі.**
Выдавецтво **«Т-во Заранка.»**

Друкарня Я. А. Грынблята.